УДК 94(47+57:438):321.011

# ПРАБЛЕМА СУВЕРЭНІТЭТУ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПОЛЬСКА-САВЕЦКІХ ПЕРАМОЎ (жнівень 1920 – сакавік 1921 гг.)

**М. М. Мязга**
доктар гістарычных навук, дацэнт
Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя Ф. Скарыны

*У артыкуле ўстаноўлена, што ў час польска-савецкіх мірных перамоў у Мінску і Рызе Беларусь не змагла выступіць у якасці суб'екта міжнародных адносін. Фактычна, а ў многім і фармальна-юрыдычна савецкі і польскі бакі не разглядалі ні БНР, ні БССР як суверэнную дзяржаву і не лічылі мэтазгодным удзел беларускіх прадстаўнікоў у перамовах. Палажэнні Рыжскага дагавора аб незалежнасці Беларусі мелі чыста дэкларатыўны характар.*

**Ключавыя словы:** БССР, БНР, суверэнітэт, польска-савецкая вайна, мірныя перамовы, Польшча, РСФСР, Рыжскі дагавор, тэрытарыяльнае пытанне, падзел Беларусі.

## Уводзіны

Рыжскі дагавор стаў адной з найбольш драматычных падзей у беларускай гісторыі ХХ ст. У выніку яго тэрыторыя Беларусі аказалася падзеленай паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Пры гэтым Беларуская дзяржава не была ў ліку ініцыятараў падпісання названага дагавора. Пытанні, звязаныя з уплывам Рыжскага міру на лёс Беларусі, дастаткова актыўна вывучаюцца ў беларускай гістарыяграфіі. Напрыклад, зусім нядаўна ўбачыла свет манаграфія В.М. Бароўскай, у якой разглядаецца шэраг аспектаў беларускай праблемы ў час савецка-польскіх перамоў [1, с. 155].

У дадзеным артыкуле зроблена спроба высветліць, як вырашалася і як уплывала на палітычныя крокі Савецкай Расіі і Польшчы ў час мірных перамоў праблема прызнання за Беларускай дзяржавай (у форме БССР ці БНР) суверэнітэту. Разглядаемая праблема распадаецца на некалькі аспектаў, якія патрабуюць комплекснага вывучэння. Неабходна ўстанавіць, ці выступала Беларусь у ролі суб'екта (аб'екта) перагаворнага працэсу, як вырашаліся пытанні аб прызнанні фармальнай незалежнасці Беларусі, удзеле ў перамовах прадстаўнікоў БССР ці БНР; разгледзець, у якой ступені ўдзельнікі перамоў лічыліся з суверэнітэтам Беларусі пры вырашэнні тэрытарыяльных пытанняў. На сённяшні дзень у гістарыяграфіі не сфармуляваны палажэнні, якія ў поўнай меры раскрывалі б названыя праблемы.

© Мязга М. М., 2018

## Асноўная частка

Ужо на пачатковым этапе польска-савецкіх перамоў у Мінску Беларусь не фігурыравала ў якасці суб'екта міжнародных адносін. На першым пасяджэнні канферэнцыі кіраўнік савецкай дэлегацыі гаварыў аб паўнамоцным прадстаўніцтве РСФСР і УССР і нічога не сказаў пра БССР [2, с. 302]. У савецкіх мірных прапановах, апублікаваных 19 жніўня 1920 г., прыгадваюцца ў якасці ўдзельнікаў перамоў толькі Расійская і Украінская савецкія рэспублікі, але не называецца БССР. Вайна 1919–1920 гг. характарызавалася як вайна паміж Польшчай, з аднаго боку, і Расійскай і Украінскай савецкімі рэспублікамі – з другога. Нават у тых палажэннях савецкага праекта дагавора, дзе размова ішла пра транзіт па чыгунцы Ваўкавыск – Беласток – Граева, г. з. праз беларускія тэрыторыі, Беларусь не прыгадвалася [3, с. 106–107]. Такім чынам, з першых пасяджэнняў мірнай канферэнцыі абазначылася лінія савецкай дэлегацыі, у адпаведнасці з якой Беларусь нават у асобе БССР не павінна была выступаць у якасці суб'екта пачаўшыхся перамоў. Гэта пры тым, што з моманту пачатку перамоў адным з цэнтральных пытанняў, якое на іх абмяркоўвалася, было пытанне граніц, непасрэдна закранаўшае інтарэсы Беларусі. Толькі калі на трэцім пленарным пасяджэнні мірнай канферэнцыі савецкаму боку трэба было знайсці аргументы супраць намераў палякаў адсунуць граніцу на ўсход ад "лініі Керзана", ён узгадаў пра незалежнасць Латвійскай, Літоўскай, Беларускай і Украінскай рэспублік [2, с. 323].

Азначаную пазіцыю савецкай дэлегацыі неабходна разглядаць у кантэксце гатоўнасці бакоў шукаць кампраміс па пытанні аб межах пераважна за кошт беларускіх зямель. У час нефармальнай сустрэчы двух дэлегацый 25 жніўня была прадэманстравана гатоўнасць Польшчы

і Савецкай Расіі ісці на ўзаемныя ўступкі па тэрытарыяльным пытанні. Польскія прадстаўнікі адмаўляліся ад рэалізацыі федэралісцкай канцэпцыі пры вырашэнні ўсходняга пытання. Савецкая дэлегацыя выказала гатоўнасць ісці на тэрытарыяльныя ўступкі, аб чым паведаміў міністру замежных спраў Польшчы кіраўнік польскай дэлегацыі Я. Домбскі ў тэлеграме ад 26 жніўня [1, с. 95–96]. Для ўрада У. Леніна беларускае пытанне было падпарадкавана ўкраінскаму пытанню. Прыбыўшы ў Мінск на першым этапе перамоў К. Радэк заявіў, што праблем не будзе пры ўмове прызнання Польшчай Савецкай Украіны [4, s. 51]. Тэрыторыя Беларусі павінна была стаць для расійскага кіраўніцтва разменнай манетай для вырашэння на яго карысць пытання аб прызнанні Польшчай Савецкай Украіны.

Польская пазіцыя па пытанні суверэнітэту Беларусі на працягу перамоў прыцярпела пэўную эвалюцыю. Яшчэ да іх пачатку віцэ-прэм'ер Дашыньскі 1 жніўня 1920 г. у якасці ўмоў, на якіх Польшча гатова пайсці на перамір'е і мір з Расіяй, назваў, у прыватнасці, "права на самавызначэнне для народнасцей, якія знаходзяцца паміж Польшчай і Расіяй" [3, с. 94]. Курс на падзел беларускіх тэрыторый першапачаткова не прадугледжваўся і ў тых інструкцыях, якія атрымала польская дэлегацыя ад Савета Абароны дзяржавы 11 жніўня. У іх гаворка ішла аб прызнанні незалежнасці Беларусі, але без вядзення перамоў аб вызначэнні яе граніц [2, с. 286]. Польская дэлегацыя ў Дэкларацыі 19 жніўня, якая з'яўлялася адказам на савецкія мірныя прапановы, заяўляла аб прызнанні незазалежнасці "Белай Русі і Украіны" на аснове свабоднага волевыяўлення беларускага і ўкраінскага народаў [3, с. 108]. Але пры гэтым адзначалася, што "польскі элемент пашыраецца далёка" за "лінію Керзана" і пры ўстанаўленні ўсходніх меж Польшчы "сіла гэтага элемента ў поўнай меры павінна быць улічана" [2, с. 320]. Дадзеная агаворка выклікае сумненні адносна гатоўнасці Польшчы прызнаць за беларусамі права на самавызначэнне. У ходзе далейшых перамоў рэальных крокаў, каб народы гэтак званых "усходніх крэсаў" мелі магчымасць рэалізаваць права на самавызначэнне, польская дэлегацыя не прадпрымала. На пасяджэнні Савета Абароны дзяржавы 11 верасня Я. Домбскі заявіў, што палякі на мінскім этапе перамоў ставілі пытанне пра Украіну ў плане яе незалежнасці, а пра Беларусь – не [2, с. 380]. Польшча згаджалася на існаванне савецкай формы дзяржаўнасці Украіны, прызнавала права ўкраінцаў на незалежнасць, але нічога не гаварылася пра БССР і права беларусаў на самавызначэнне [2, с. 388].

1 кастрычніка 1920 г. польская дэлегацыя заявіла, што Польшча можа або згадзіцца са стварэннем на сваіх усходніх межах буферных дяржаў (у тым ліку Беларусі), або правесці мяжу такім чынам, каб чыгунка Ліда – Баранавічы – Лунінец – Роўна – Броды знаходзілася ў глыбіні польскай тэрыторыі. Права выбару з гэтых двух варыянтаў палякі пакідалі за кіраўніцтвам РСФСР. Пасля кансультацыі з Масквой А. Іофэ аддаў перавагу другому варыянту [5, s. 48–49]. Пазіцыю савецкага ўрада па гэтым пытанні Г. Чычэрын патлумачыў у лісце У. Леніну ад 25 жніўня. Ён даказваў немагчымасць для Савецкай Расіі выступіць з прапановай аб вывадзе з тэрыторыі Беларусі і Украіны ўсіх замежных войск, бо становішча бальшавікоў на гэтых тэрыторыях няўстойлівае і ёсць рызыка страціць уладу [6, с. 4–5]. Каб парыраваць польскія патрабаванні аб стварэнні буферных дзяржаў, РСФСР з гатоўнасцю ішла на тэрытарыяльныя ўступкі. Г. Чычэрын прама пра гэта сказаў на 2-й надзвычайнай сесіі УЦВК 23 кастрычніка 1920 г.: "<…> мы прапанавалі Польшчы тэрытарыяльныя прырашчэнні за адмову Польшчы ад палітыкі буфералізма, ад палітыкі гэтак званага федэралізма, стварэння буфералісцкіх дзяржаў, у прыватнасці, пятлюраўскай" [3, с. 213–214]. Тым самым на перамовах канчаткова перамагла лінія на дасягненне пагаднення на аснове падзелу беларускіх і ўкраінскіх тэрыторый.

Зыходзячы з той палітыкі, якая праводзілася польскім бокам па пытанні беларускай дзяржаўнасці ў час вайны 1919–1920 гг., праграмных установак асноўных палітычных сіл Польшчы па пытанні польскай усходняй мяжы, наўрад ці можна гаварыць аб рэальным намеры польскага боку дабівацца ў час перамоў стварэння сапраўды незалежнай белару-

скай дзяржавы, тым больш у яе этнічных межах [7]. У ходзе дыскусіі, якая ўзнікла ўнутры польскай дэлегацыі, большасць выказалася супраць уключэння Мінска ў склад Польшчы і за падзел беларускіх зямель. Гэта азначала, што канцэпцыя федэрацыі пацярпела паражэнне, і Польшча адмовілася ад падтрымкі стварэння Беларускай дзяржавы.

Пазіцыя савецкага кіраўніцтва таксама заставалася неспрыяльнай для Беларусі. Калі яно не выказвала жадання бачыць БССР у якасці суб'екта перамоў на пачатковым іх этапе, то яшчэ менш падстаў для гэтага было на іх рыжскім этапе, на якім рэалізоўваўся курс на "згодніцкі" мір з Польшчай. Гэты курс фактычна быў адобраны Палітбюро на пасяджэнні 1 верасня, калі было прынята рашэнне аб змене складу савецкай дэлегацыі на перамовах з Польшчай [6, с. 8–9]. У апошняй дэкадзе верасня ідэя "згодніцкага" міру з Польшчай атрымала канчатковае афармленне. 20 верасня пленум ЦК даручыў камісіі ў складзе К. Радэкі, Л. Каменева, Г. Чычэрына распрацаваць праект дэкларацыі УЦВК па польска-савецкіх перамовах [6, с. 59]. У гэтыя ж дні У. Ленін пісаў А. Іофэ пра магчымасць пайсці на тэрытарыяльныя ўступкі і згадзіцца на мяжу па лініі р. Шчара – канал Агінскага – р. Ясельда, прапанаваную глаўкомам С. Каменевым, пры ўмове, што мір будзе падпісаны на працягу 10 дзён [6, с. 59]. 23 верасня УЦВК прыняў пастанову аб савецка-польскіх перамовах, у якой выказвалася гатоўнасць Савецкай Расіі пайсці на значныя тэрытарыяльныя ўступкі [3, с. 400]. Такім чынам, важнейшае для лёсу Беларусі рашэнне зноў прымалася без уліку пункту гледжання прадстаўнікоў хаця б ВРК БССР. Пры гэтым у пастанове адзначалася, что Польшча і Расія пацвярджаюць незалежнасць Літвы, Беларусі і Украіны. Улічваючы палітыку кіраўніцтва РСФСР і Польшчы па вырашэнні важнейшых для Беларусі пытанняў без яе прадстаўнікоў, тэзіс аб прызнанні яе незалежнасці меў чыста дэкларатыўны характар.

Пры гэтым Савецкая Расія разглядала беларускія землі як "свае". 23 кастрычніка 1920 г., выступаючы на сесіі УЦВК па пытанні ратыфікацыі прэлімінарнага дагавора, Г Чычэрын адзначыў, што Польшча "абяцае не ўмешвацца ва ўнутраныя справы Савецкай Расіі і Савецкай Беларусі ў той частцы Беларусі, якая застаецца за Расіяй <…>. Такім чынам, мы пазбаўляемся ўсходняй часткі Віленскай губерні, <…> трэцяй часткі Мінскай губерні <…>" [6, с. 99].

28 верасня А. Іофэ прадставіў польскай дэлегацыі савецкія мірныя прапановы, у аснове якіх ляжалі палажэнні пастановы УЦВК ад 23 верасня. У артыкуле 5 праекта дагавора вызначалася лінія мяжы: "ад дзяржаўнай граніцы Літвы з Беларуссю каля ўпадзення ракі Свіслач у раку Нёман да паселішча Свіслач, Рудня, Белавеж, Камянец-Літоўск, Брэст-Літоўск" [2, с. 401–403]. Тым самым фактычна паўтаралася "лінія Керзана" з невялікімі ўступкамі на карысць Польшчы за кошт беларускіх тэрыторый. Пры гэтым незразумела, як савецкія прапановы стыкаваліся з савецка-літоўскім дагаворам ад 12 ліпеня 1920 г., які прадугледжваў перадачу зямель паўночна-заходняй Беларусі Літве. Савецкі праект ўтрымліваў і патрабаванне да Польшчы прызнаць незалежнасць Літвы, Беларусі і Украіны і грамадскі лад, які там усталяваўся [2, с. 402–407]. Са свайго боку польская дэлегацыя не прызнала БССР суверэннай дзяржавай, спаслаўшыся, у прыватнасці, на тое, што Расія лічыла сябе ў праве распараджацца беларускімі землямі пры падпісанні дагавора з Літвой 12 ліпеня 1920 г. [2, с. 328].

У ходзе далейшых перамоў расійская савецкая дэлегацыя ішла на новыя тэрытарыяльныя ўступкі, перадаючы Польшчы землі БССР, незалежнасць якой Масква юрыдычна прызнала і фармальна не магла распараджацца яе тэрыторыяй. Але тэрытарыяльныя ўступкі за кошт Беларусі з'яўляліся платай РСФСР за хуткі мір з Польшчай, да чаго ў той момант імкнуўся ўрад У. Леніна. Дзеля дасягнення гэтай мэты Масква лічыла магчымым адкінуць гульню ў суверэнітэт БССР 2 кастрычніка палітбюро прыняло рашэнне "згадзіцца на лінію, якая аддае Польшчы чыгунку Ліда – Баранавічы пры ўмове, што мір (і перамір'е) будзе падпісаны ў самы кароткі тэрмін (тры дні прыкладна)". У той жа дзень Г. Чычэрын паведаміў А. Іофэ, што палітбюро вырашыла прыняць мяжу, якая праходзіць на ўсход ад чыгункі

Ліда – Баранавічы – Лунінец – Роўна [8, с. 396–397]. 9 кастрычніка палітбюро прыняло рашэнне ісці на далейшыя ўступкі палякам пры ўмове неадкладнага падпісання мірнага дагавора, аб чым было паведамлена А. Іофэ [3, с. 183].

У прэлімінарным мірным дагаворы заяўлялася аб прызнанні незалежнасці Украіны і Беларусі і ўсталяванні меж Польшчы менавіта з гэтымі краінамі [2, с. 429]. Але ў наступных артыкулах дагавора гаворка ідзе аб правах толькі ўкраінскіх і расійскіх грамадзян і не прыгадваюцца беларускае грамадзянства і нацыянальнасць [2, с. 430]. Адным з важнейшых аспектаў прэлімінарнага мірнага дагавора, падпісанага без удзелу беларускіх прадстаўнікоў, стаў падзел Беларусі. Яе заходняя частка адыходзіла да Польшчы, а ўсходнія беларускія землі заставаліся ў складзе РСФСР.

Кіраўніцтва БССР рабіла пэўныя захады, как дабіцца ўдзелу ў перамовах, якія непасрэдна закраналі інтарэсы Беларусі. Як вядома, 10 верасня ВРК БССР прыняў рашэнне "выдаць РСФСР самы шырокі мандат на вядзенне перагавораў з Польшчай па пытанні галоўным чынам аб вызначэнні меж Беларусі". На пачаўшыхся у Рызе перамовах савецкай дэлегацыі важна было прадставіць палякам дакументы, якія б пацвярджалі яе права на ўсталяванне меж Беларусі [3, с. 163]. У адпаведнасці з тым жа рашэннем ВРК ад 10 верасня былі намеры накіраваць на перамовы і прадстаўніка ад БССР В. Ігнатоўскага "для абароны інтарэсаў самастойнасці Рэспублікі Беларусь" [3, с. 143]. Насамрэч ад імя ВРК БССР у Рыгу прыбыў А. Чарвякоў. Яго рэальны ўдзел у перагаворах залежаў ад гатоўнасці Савецкай Расіі і Польшчы прызнаваць БССР у якасці суверэннай дзяржавы. Польскі бок не прызнаваў лігітымнасці савецкай формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, а адсюль і права прадстаўнікоў ВРК БССР удзельнічаць у перамовах. У якасці аднаго з аргументаў для абгрунтавання сваёй пазіцыі палякі звярталі ўвагу на нявызначанасць усходняй мяжы Беларусі. Таксама негатыўную пазіцыю адносна ўдзелу прадстаўніка БССР у перамовах заняла савецкая расійская дэлегацыя. У тэлеграме Г. Чычэрыну ад 23 верасня А. Іофэ выказваў меркаванне, што А. Чарвякоў павінен заставацца ў ролі кансультанта ці эксперта да больш спрыяльнага моманту [1, с. 155, 157]. Такім чынам, калі і быў варыянт удзелу прадстаўніка БССР у перамовах, то не як дэлегата ад незалежнай краіны. Гэты ўдзел патрэбен быў савецкаму ўраду на той выпадак, калі б польскі бок паставіў пытанне аб ўдзеле ў перамовах у якасці прадстаўнікоў Беларусі дэлегацыі ад БНР Тады можна было б заявіць, што Беларусь на перамовах ужо прадстаўлена. 14 верасня Г. Чычэрын пісаў А. Іофэ, што ў сувязі з выступленнем Ластоўскага "я папрасіў Смілгу паскорыць прыезд беларускага савецкага прадстаўніцтва" [2, с. 143]. Для ўрада У. Леніна пытанне аб удзеле БССР у перамовах у Рызе набыло высокую ступень актуальнасці ў сувязі з падрыхтоўкай склікання 2-га Усебеларускага з'езда Саветаў. 14 верасня ВРК ССРБ па ўказанню з Масквы прыйшлося тэрмінова прымаць рашэнне аб адмене выбараў на Усебеларускі з'езд Саветаў [9, с. 8], бо існавала апасенне, што на з'ездзе можа быць узнята пытанне аб удзеле дэлегацыі БССР у перамовах.

Кіраўніцтва БССР, якая была зведзена да шасці паветаў Мінскай губерні, не магло пярэчыць Маскве і на сумесным пасяджэнні ВРК і Цэнтральнага бюро прафесійных саюзаў Беларусі 27 кастрычніка правяло ратыфікацыю прэлімінарнага міру з Польшчай. Але пры гэтым яно лічыла неабходным свой удзел у савецка-польскіх перамовах аб распрацоўцы канчатковага варыянту дагавора і паставіла адпаведнае пытанне перад савецкім расійскім урадам. 8 лістапада 1920 г. ЦК КП(б)Б абмеркаваў даклад В. Кнорына аб паездцы ў ЦК РКП(б) для перамоў па справах Беларусі. Ён паведаміў, што М. Крэсцінскі пасля размовы з Г. Чычэрыным заявіў аб адсутнасці неабходнасці ўдзелу беларускай дэлегацыі ў перамовах [1, с. 159]. На новым этапе перамоў Савецкая Беларусь па-ранейшаму не разглядалася прадстаўленымі на іх бакамі як суб'ект міжнародных адносін. Напрыклад, калі на пасяджэнні дэлегацый 13 лістапада зайшла гаворка аб магчымым аднаўленні вайны, то мелася на ўвазе, што гэта будзе вайна "Расіі і Украіны з Польшчай" [3, с. 231]. У прынятым у ходзе перамоў пра-

таколе аб стварэнні Пагранічнай камісіі нічога не было сказана пра прадстаўніцтва ў ёй БССР разам з РСФСР і УССР [2, с. 531].

Пытанне аб месцы Беларусі на польска-савецкіх перамовах зноў актуалізавалася для расійскага савецкага ўрада ў снежні 1920 г. у сувязі са скліканнем Усебеларускага з'езда Саветаў. 12 снежня прадстаўнік РСФСР у Мінску Іарданскі паведаміў Г Чычэрыну, што на з'ездзе, магчыма, будзе ўзнята пытанне аб удзеле беларускага дэлегата ў перамовах у Рызе, і прасіў адпаведных інструкцый [3, с. 247]. У сувязі з выбарамі на Усебеларускі з'езд Саветаў у маскоўскага кіраўніцтва не было ўпэўненасці, што "на з'езд пройдуць савецкі настроеныя элементы" [3, с. 235]. Абмеркаванне дадзенага пытання адбылося ў ходзе тэлэфоннай размовы Кнорына і Чычэрына 13 снежня. Расійскі наркам замежных спраў звярнуў увагу на неаформленасць беларускага ўрада, што рабіла немагчымым яго ўдзел у перамовах. Наяўнасць у Рызе беларускага прадстаўніка, па словах Г. Чычэрына, была б нязручнай пасля таго, як асноўныя пытанні ўжо былі аформлены ў прэлімінарным дагаворы [3, с. 247]. Але відавочна, што "аформленасць" урада БССР цалкам залежала ад Масквы. Цікавую пазіцыю адносна ўдзелу прадстаўнікоў Савецкай Беларусі ў перамовах заняў А. Іофэ. Ён разглядаў такую магчымасць толькі ў выпадку павелічэння тэрыторыі Беларускай рэспублікі за кошт Віцебскай і Гомельскай губерняў [1, с. 159]. Але ў канцы 1920 г савецкае кіраўніцтва лічыла немэтазгодным далучэнне да БССР усходніх губерняў, бо, як пісаў Г. Чычэрын у адным з лістоў, "мы яшчэ не ведаем, праз якія цяжкасці можа прайсці лёс Беларусі, і павялічваць загадзя тую тэрыторыю, якая праз гэтыя цяжкасці будзе праходзіць, было б надзвычай неасцярожна" [3, с. 221]. 17 лістапада ў Маскве адбылася нарада з удзелам кіраўнікоў БССР – А. Чарвякова, В. Кнорына, на якой разглядалася пытанне "аб тэрыторыі Савецкай Беларусі". У прынятай пастанове канстатавалася "прызнаць у сучасны момант несвоечасовасць вырашэння гэтага пытання" [10, с. 140]. 18 лістапада палітбюро ЦК РКП(б) адобрыла рашэнне, прынятае па беларускім пытанні на названай нарадзе [11].

Адсутнасць беларускага ўрада, альтэрнатыўнага савецкаму і прызнанага Польшчай, дазваляла савецкаму расійскаму ўраду не настойваць на ўдзеле ў перамовах дэлегацыі БССР у адрозненне ад УССР. Тым больш што ход перамоў патрабаваў ад савецкага ўрада новых тэрытарыяльных уступак Польшчы за кошт Беларусі. 30 снежня Г Чычэрын у лісце палітбюро чарговы раз даказваў немэтазгоднасць удзелу прадстаўнікоў Беларусі ў перамовах з палякамі, бо гэта "разбура ўсе нашы дыпламатычныя камбінацыі" [3, с. 258]. Гэтыя дыпламатычныя камбінацыі ўключалі далейшыя тэрытарыяльныя ўступкі Польшчы. У снежні 1920 г. савецкі бок пагадзіўся перадаць Польшчы ў раёне Турава каля 3000 кв. вёрст у параўнанні з прэлімінарным дагаворам [3, с. 253]. У лютым 1921 г. А. Іофэ заявіў аб гатоўнасці аддаць Польшчы тэрыторыі ў раёне Радашковіч [3, с. 295].

## Заключэнне

Такім чынам, Беларусь не змагла выступіць у ходзе польска-савецкіх мірных перамоў як іх фармальны ўдзельнік у статусе, роўным таму, які мела УССР Як Савецкая Расія, так і Польшча не былі зацікаўлены ва ўдзеле прадстаўнікоў Беларусі ў перамоўным працэсе, бо гэта магло стварыць праблемы ў дасягненні кампрамісу паміж яго ўдзельнікамі, у аснове якога ляжаў падзел беларускіх тэрыторый. Пры гэтым як савецкі, так і польскі бок абсалютна не звярталі ўвагі на суверэнітэт Беларусі і лічылі сябе ў праве распараджацца беларускімі землямі для рэалізацыі сваіх дыпламатычных камбінацый. У такой сітуацыі абвешчаная Рыжскім дагаворам незалежнасць Беларусі мела чыста дэкларатыўны характар.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. ***Бароўская, В. М.*** Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В.М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.
2. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14. – Москва : Наука, 1965. – Т. 3. – 609 с.
3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. / склад.: А. Ф. Вялікі [і інш] ; рэкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. – Мінск : Юніпак, 1997. – Т. 1, ч. 2. – 393 с.

4. Wojdyło, W. Traktat w Rydze w koncepcjach obozu narodowego ze szczególnym uwzględnieniem roli Stanislawa Grabskiego / W. Wojdyło // Traktat Ryski 1921 roku po 75 latach. –Toruń : Wyd. UMK, 1998. – S. 47–61.
5. ***Kumaniecki, J.*** Pokyj polsko-radziecki, 1921. Geneza, rokowania, traktat, komisie mieszane / J. Kumaniecki. – Warszawa: Biblioteka Narodowa, 1986. 240 s.
6. Польско-советская война 1919–1920 (Ранее не опубликованные документы и материалы) : в 2 ч. – Москва : Институт славяноведения и балканистики, 1994. – Ч. 2. – 236 с.
7. ***Мязга, М. М.*** Пытанне беларускай дзяржаўнасці ў палітыцы Польшчы ў час польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў / М. М. Мязга // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зборнік навуковых артыкулаў. – Вып. 2. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2013. – С. 59–66.
8. В. И. Ленин. Неизвестные документы. 1891–1922 гг. – Москва : РОССПЭН, 2000. – 607 с.
9. ***Лазько, Р. Р.*** Польска-савецкія мірныя перагаворы 1920 г. і лёс Беларусі / Р. Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – № 12. – С. 5–12.
10. ***Ладысеў, У. Ф.*** Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.
11. [Электронный ресурс]. – http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=57995;tab=img0091. – Дата доступа: 10.10.2017.

Поступила в редакцию 08.11.2017 г.
Кантакты: nmezga@gsu.by
(Мязга Мікалай Мікалаевіч)

**Mlazga, M. THE ISSUE OF BELARUSIAN SOVEREIGNTY IN THE CONTEXT OF POLISH-SOVIET NEGOTIATIONS (August 1920 – March 1921).**

*The article confirms that during the Soviet-Polish peace talks in Minsk and Riga Belarus failed to act as a subject of international relations. In fact, both the Soviet Union and Poland did not consider the Belarusian People's Republic and the Byelorussian Soviet Socialist Republic as a sovereign country, and they did not find the participation of the Belarusian representatives in the peace talks to be meaningful. The statements of the Peace of Riga about Belarusian independence were totally declarative.*

**Keywords:** BSSR, BPR, sovereignty, Soviet-Polish war, peace talks, Poland, RSFSR, the Peace of Riga, territory problem, partition of Belarus.